УДК 808.26+800.87+801.5-54

В. У. КЛІМЕНКА

ПАРАЛЕЛЬНАЯ ДЭРЫВАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРМАТЫЎНАЙ І ДЫЯЛЕКТНАЙ МОВЕ

Матываванасць з'яўляецца адной з тыповых рыс дыялектнага словаўжывання. Сярод тэрытарыяльна абмежаваных найменняў, адпаведных літаратурным па структуры, знешніх адзнаках, але нятоесных ім паводле семантыкі, асноўную частку складаюць вытворныя субстантывы.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Паралельная дэрывацыя (незалежнае ўтварэнне слоў па адной дэрывацыйнай мадэлі ад аднаго кораня) – прадуктыўная з'ява як у літаратурнай, так і ў дыялектнай мове. Заканамернасці словаўтварэння не маюць істотных размежаванняў для гэтых дзвюх разнавіднасцей агульнанароднай мовы. У гаворках знаходзяць больш шырокую рэалізацыю магчымасці развіцця семантыкі, якія закладзены ў вытворных, матываваных адзінках унармаванай мовы.

Кваліфікацыя падобных паралельных дэрыватаў у навуковай літаратуры вельмі неадназначная. А. Н. Ціханаў лічыць іх словаўтваральнымі амонімамі [1], Л. Р. Яцкевіч прапануе называць словаўтваральна-семантычнымі варыянтамі слова [2]. В. У. Вінаградаў трактуе рускае *резак* 'лапатка ў тынкоўшчыка' і *резак* 'рабочы – спецыяліст па забою жывёлы' як амонімы [3, с. 89], а *рогач* 'жук', 'самец-алень', 'вілкі' аб'ядноўвае ў адну семантычную структуру на аснове агульнасці ўнутранай прыметы наймення [3, с. 112-113]. П.А. Собалева адносіць такія словы да полісемантаў, звязаных апасродкаванай сувяззю [4], В. Дз. Старычонак разглядае іх у межах мнагазначнасці [5, с. 156-177].

Розныя лексіка-семантычныя варыянты слова (ЛСВ) пры «класічнай» полісеміі звязаны праз элемент іх зместу, які выдзяляецца чалавечым мысленнем імпліцытна, скрыта, не мае выражэння ў знешняй форме лексемы. Наяўнасць агульнага, інварыянтнага кампаненту семантыкі паралельных дэрыватаў з рознымі значэннямі маркіруецца каранёвай марфемай: *сів-ец* 'неўрадлівая глеба с і в о г а колеру' (СПЗБ), 'пра каня с і в о й масці'(НЛГ). Паміж значэннямі матываванага слова тут не існуе адносін вытворнасці, такія ЛСВ неўзаемаабумоўленыя і звязаны праз утваральнае слова, «спасылка» на якое экспліцытна прадстаўлена ў корані.

Прынцыпы сувязі ЛСВ вытворных слоў аналагічныя тым, што характэрны для «класічнай» полісеміі, і падводзяцца часцей за ўсё пад метафарычную і метанімічную мадэлі. Метафарычная суаднесенасць адлюстравана ў адпрыметнікавых (адад'ектыўных) субстантывах. Яны абазначаюць дэнататы, звязаныя сімілятыўнай сувяззю паводле падабенства прымет. Часта падобныя ЛСВ злучае прымета па колеры: *зялёнка* 'вадкасць зялёнага колеру для змазвання скуры'(ТСБМ), 'зяленая маса, корм для жывёлы'(СПЗБ); *бель* 'адбеленыя ніткі'(СГЦР, НЛ, СПЗБ), 'белая фарба'(ЖНС), 'белы наліў, белае адзенне'(СПЗБ). Гэта прадметныя, намінатыўна-вытворныя значэнні са «сцёртай» метафарычнасцю. У матываваных назвах, якія маюць дачыненне да асобы, аднаўляецца вобразнасць метафары. Яны, як правіла, заснаваны на пераносных значэннях утваральнага прыметніка: *гнілушка* (<*гнілы* 'слабы') 'слабая, нямоглая асоба' (НВС), *пустата* (<*пусты* 'несур'ёзны') 'пусты чалавек' (НВС), *пустыня* 'тс'(НВС), *пустэча* 'тс' (Янк. І, МММГ-70). Выкарыстанне слоў з такімі значэннямі вельмі характэрна менавіта для гаворак, у літаратурнай мове гэтыя лексемы маюць прадметную семантыку.

У некаторых навуковых работах разглядаюцца сувязі працэсаў дэрывацыі з асаблівасцямі сінтаксічнай спалучальнасці ўтваральных адзінак, звяртаецца ўвага на магчымасць разгортвання, аналітычнага прадстаўлення семантыкі вытворнай лексемы [6]. Пры разгортванні адад'ектыўнага слова ў словазлучэнне звычайна атрымліваецца двухкампанентная структура (прыметнік+назоўнік): *бель* – «белыя ніткі», «белая фарба», «белае адзенне». Інварыянтнае лексічнае значэнне прыметніка ў вытворным слове эксплікавана, выяўлена ў каранёвай марфеме (*бел'*-), а назоўнік з'яўляецца «прырашчэннем», яго семантыка не прадстаўлена ў структуры матываванага слова, таму можа вар'іравацца. У той жа час назоўнік у адзначаных словазлучэннях-аналагах дэрыватаў (дэрывацыйных словазлучэннях) выступае ў якасці апорнага, асноўнага пры ідэнтыфікацыі рэаліі,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

названай вытворным словам. Такім чынам, назоўнік тут выконвае ідэнтыфікуючую функцыю, забяспечвае рэпрэзентацыю рэаліі (ідэнтыфікуючы кампанент – ІК), а прыметнік з'яўляецца экспанентам дэрывацыйнага словазлучэння ў вытворнай лексеме (эксплiцытны кампанент – ЭК).

Метанімічны тып адносін назіраецца паміж ЛСВ субстантываў, утвораных ад назоўнікаў або ад адносных прыметнікаў, якія ўзводзяцца да назоўнікаў. Метанімія – гэта адлюстраванне рэальных сувязей дэнатататаў па сумежнасці. Звядзенне падобных значэнняў полісеманта ў адну сэнсавую структуру адбываецца на аснове іх адносін – часам вельмі рознапланавых – да адной рэаліі. Найбольш рэгулярнымі метанімічнымі сувязямі сярод тых матываваных слоў, якія ў гаворках развіваюць іншыя значэнні ў параўнанні з літаратурнай мовай, выступаюць сувязі па матэрыяле: *ватнік* 'ватовая куртка'(ТСБМ), 'ватовая коўдра', *ватнікі* 'ватовыя штаны'(СГЦР); *жалязняк* 'жалезная руда'(ТСБМ), 'чыгун' (Сцяшк., Сл.), 'рыдлёўка, берагі якой акоўваюцца жалезам'(Янк. III); па месцы: *баравік* 'белы грыб (які расце ў барах)'(ТСБМ), 'мядзведзь, які жыве ў бары; дух, які жыве ў бары'(Нас.), 'перасяленец з лясных вёсак і хутароў'(НС); па спосабе харчавання (адрозніваецца значнай прадуктыўнасцю ў народнай мове): *аўчар* 'воўк, які нападае пераважна на авечак'(СПЗБ) – параўн. літаратурнае *аўчар* 'пастух, які пасе авечак'(ТСБМ), *сяньнік* 'пражэрлівы конь'(НЛ) – параўн. *сяннік* 'матрац, набіты сенам ці саломай'(ТСБМ). Радзей узаемадзеянне ЛСВ, якія ўваходзяць у склад семантычнай парадыгмы вытворнага слова, мае метафарычную прыроду: *пухавік* (<падобны на пух) 'маладое цеста, якое падыйшло на дражджах' (СРЛГ), (зроблены з пуху) 'пуховая пярына' (ТСБМ); *рагач* (<падобны на рогі) 'ручка ў сасе'(Касп.), 'прылада ў калаўроце' (Касп., БДС), 'корч, саха, вілы'(ТСБМ).

У сінтагматычным плане разлажэнне на інгрэдыенты семантыкі адсубстантыўных назоўнікаў прыводзіць да вылучэння трох частак:

- *крываўка* 'крывяная каўбаса'(СПЗБ) – «каўбаса, зробленая з крыві»; *ватнік, ватнікі* (гл. вышэй) – «адзенне, зробленае з ваты»; *жалязняк* – 'рэч (чыгун, рыдлёўка), зробленая з жалеза' (**матэрыял**);
- *сырнік* 'мяшочак для адціскання сыру'(Сцяшк.) – «мяшочак (месца), дзе знаходзіцца сыр», *кароўнік* 'памяшканне для кароў'(ТСБМ) – «месца, дзе знаходзяцца каровы», *баравік* (гл. вышэй) – «грыб, мядзведзь, дух, які знаходзіцца ў бары' (**месца**);
- *рыбак* 'рачная чайка'(ТС) – «чайка, якая харчуецца рыбай», *сяннік* (гл. вышэй) – «конь, які <часта> харчуецца сенам», *аўчар* – «воўк, які харчуецца авечкамі»(**спосаб харчавання**);
- *пухавік* (гл. вышэй) – «цеста, падобнае на пух», *рагач* – «прадмет (вілкі, саха і інш.), падобны на рогі» (**сімілятыўныя, метафарычныя адносіны**).

Унутраны змест такіх адсубстантыўных дэрыватаў, які раскрываецца пры іх расчляненні, падразумявае наяўнасць трох кампанентаў. Першы кампанент прыведзеных вышэй дэрывацыйных словазлучэнняў – ідэнтыфікуючы (ІК) – рэалія, якая абазначана вытворным назоўнікам. Яна не выражана ў знешняй форме наймення і таму можа вар'іравацца. Трэці кампанент (эксплiцытны (ЭК)) – рэалія, што абазначана ўтваральным назоўнікам, яна выражана ў корані вытворнага слова, інварыянтная, служыць сродкам інтэграцыі розных ЛСВ вытворнага слова. Адносіны паміж ІК і ЭК у большасці выпадкаў зводзяцца да чатырох тыпаў, якія можна акрэсліць пры дапамозе дзеяслоўных слоў «зроблены з» (матэрыял), «знаходзіцца» (месца), «харчуецца» (спосаб харчавання), «падобны на» (метафара). Назавем гэты кампанент рэлятыўным (РК). Такім чынам, у выніку аналітычнага прадстаўлення семантыкі адсубстантыўных назоўнікаў вызначаюцца чатыры асноўныя тыпы:

Мемориальная страница Ивана Ивановича Лепешова

	ІК	РК	ЭК
1. Матэрыял	рэч, зробленая з пэўнага матэрыялу гл. *крываўка, ватнік, жалязняк*	«зроблены з»	матэрыял
2. Месца	а) месца, дзе знаходзіцца рэалія гл. *сырнік, кароўнік*	«знаходзіцца»	рэалія
	б) рэалія гл. *баравік*	«знаходзіцца»	месца, дзе знаходзіцца рэалія
3. Спосаб харчавання	суб'ект гл. *рыбак, сяннік, аўчар*	«харчуецца»	тое, чым харчуецца суб'ект
4. Сімілятыўныя адносіны (метафара)	рэалія, якая параўноўваецца гл. *пухавік, рагач*	«падобны на»	рэалія, з якой параўноўваецца

Аддзеяслоўныя найменні складаюць самую значную групу сярод вытворных субстантываў [3, с. 81; 5, с. 163]. Калі назоўнік абазначаецца дзеясловам, маюць месца адносіны рэаліі і працэсу (стану), якія могуць выяўляцца ў чатырох асноўных формах, што адпавядаюць сінтаксічным валентнасцям дзеяслова : «дзеянне – яго суб'ект», «дзеянне – яго аб'ект (вынік)», «дзеянне – яго сродак», «дзеянне – яго месца» (параўн. метанімічныя пераносы такога тыпу).

У аспекце супастаўляльнага аналізу паралельных дэрыватаў нарматыўнай і дыялектнай мовы найбольшай частотнасцю вылучаецца спалучэнне ў адной аддзеяслоўнай лексеме значэнняў сродку і аб'екту (выніку) дзеяння: *церніца* 'прылада, пры дапамозе якой труць лён, каноплі'(ТСБМ) (сродак), 'змятая салома'(Касп., НЛ) (вынік), *набойка* 'бандарская прылада для нацягвання абручоў' (НС) (сродак), 'ніжні слой абцаса'(ТСБМ) (аб'ект). Часам у падобных выпадках значэнні сродку і аб'екту некарэлятыўныя, г. зн. дэрываты ўзыходзяць да розных мадыфікацый сэнсу ўтваральнага дзеяслова. Напрыклад, значэнне сродку ў слове *церніца* – 'прылада, пры дапамозе якой труць лён, каноплі', а значэнне аб'екту развілося несуадноснае: замест 'змятыя, цёртыя лён, каноплі' – 'змятая салома'. Гэта тлумачыцца перш за ўсё функцыянаваннем дэрыватаў у розных моўных кантынуумах (асобных гаворках і літаратурнай мове). Карэлятыўнасць назіраецца пры суіснаванні значэнняў сродку і аб'екту ў адной гаворцы: *капаніца* 'лапата'(сродак), 'доўгая канава, выкапаная ўручную'(вынік) (СГЦР), *набойка* 'дошка з рэльефным або металічным узорам у набіўной вытворчасці' (сродак), 'палатно з белымі ўзорамі па каляроваму полю'(вынік) (Касп.). Калі аддзеяслоўны дэрыват сумяшчае значэнні суб'екту і аб'екту, што назіраецца, дарэчы, рэдка, то яны карэлятыўныя, суадносныя паміж сабой: *пастух* 'той, хто пасе статак' (ТСБМ) (суб'ект), 'статак' (МММГ-74, ДС) (аб'ект), *глум* 'непрактычны чалавек' (МММГ-74, СГЦР) (суб'ект), 'пра штонебудзь марна страчанае, папсаванае' (ТСБМ) (аб'ект).

Уключэнне ў змест адной лексемы агентыўнага і прадметнага значэнняў прадугледжвае два тыпы суадносін паміж імі: суб'ект і сродак, адушаўлёны і неадушаўлёны суб'ект. Пры першым тыпе суадносін агентыўны і прадметны ЛСВ зводзяцца да аднаго значэння ўтваральнага дзеяслова, бо ён указвае на адну і тую ж функцыю, якая выконваецца суб'ектам і сродкам: *пугач* 'той, хто палохае, пужае' (Бяльк.) (суб'ект), 'пісталет-цацка' (ТСБМ) (сродак), *цясак* 'той, хто апрацоўвае павалены лес і іншыя рэчы цяслярскай сякерай' (СПЗБ) (суб'ект), 'цяслярская сякера' (ТСБМ) (сродак). Карэлятыўнасць сродку і аб'екту, суб'екту і аб'екту,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

суб'екту і сродку, іх сумежнасць, якая грунтуецца на тоеснасці ўтваральнага дзеяслова, робіць верагоднай наяўнасць не паралельнай дэрывацыйнай, а метанімічнай сувязі ў яе класічным разуменні (магчыма, тут прысутнічаюць абодва віды сувязі).

Сінтаксічныя валентнасці дзеяслова, што дыферэнцыруюць вытворныя ад яго субстантывы паводле значэнняў суб'екту, аб'екту, сродку, месца дзеяння, адрозніваюцца ад семантычных валентнасцей [7]. Умовай рэалізацыі апошніх у аддзеяслоўным дэрываце з'яўляецца тоеснасць сінтаксічнай валентнасці, г. зн., усе ЛСВ вытворнага назоўніка рэалізуюць, напрыклад, толькі сінтаксічную валентнасць суб'екту дзеяння. Такія суб'екты звычайна семантычна несумяшчальныя. Другі тып суадносін агентыўнага і прадметнага значэнняў (адушаўлёны і неадушаўлёны суб'ект – гл. вышэй) можа праілюстраваць размежаванне паводле семантычных валентнасцей пры эквівалентнасці сінтаксічнай (суб'ект): *сечка* 'дробна нарэзаная салома; драблёныя крупы' (ТСБМ), 'сварлівая кабета' (Яўс., НВС), *ліпучка* 'пра што-небудзь ліпкае, клейкае' (ТСБМ), 'навязлівая асоба'(НВС). Агентыўныя значэнні прыведзеных слоў уласцівы пераважна дыялектнай мове і заснаваны на пераносных значэннях матывуючага дзеяслова: *сечка<секчы* 'сварыцца', *ліпучка< ліпнуць*'навязвацца'.Найбольш часта ЛСВ, узнікшыя на аснове розных семантычных валентнасцей, злучаюцца агульнай сінтаксічнай валентнасцю аб'екту: *набой* 'мазоль '(МДСГ, СПЗБ, Сцяшк.), 'снег на дарозе, убіты (утрамбаваны) конскімі капытамі' (Цых.), 'зарад пораху'(ТСБМ). Магчымасць спалучэння ўтваральнага дзеяслова з цалкам нятоеснымі дэнататамі сведчыць аб расслаенні яго семантыкі (суадносна: набіць мазоль <ходзячы, зрабіць сабе мазоль, набіць снег на дарозе< утрамбаваць, набіць зарад < напхаць). Цэласнасць семантычнай структуры паралельных дэрыватаў, якія грунтуюцца на розных значэннях полісемічнага матывуючага дзеяслова, парушаецца, такія ЛСВ маюць схільнасць да аманіміі.

Словаўтварэнне ад розных, але семантычна і структурна блізкіх моўных адзінак робіць сувязь вытворных лексем яшчэ больш апасродкаванай: *лом* (<*ламаць*) 'завостраная палка' (ТСБМ), *лом* (<*ламіць*) 'боль у касцях' (Бяльк.), *лапатуха* (<*лапатаць*) 'жанчына, якая вельмі многа гаворыць' (ТСБМ), *лапатуха* (<*лапацець*) 'карбатае месца на астрыі касы' (СНС).

Паралельнае словаўтварэнне ў нарматыўнай мове і гаворках мае агульныя асаблівасці: мадыфікацыі значэння вытворнага субстантыва звычайна аб'ядноўваюцца ў адну сэнсавую парадыгму на аснове адносін, аналагічных метафары (у адпрыметнікавых, асобных адназоўнікавых дэрыватах) або метаніміі (у адназоўнікавых і аддзеяслоўных дэрыватах). Дыферэнцыяцыя, тэндэнцыя да распаду семантычнага адзінства назіраецца толькі ў тых выпадках, калі ЛСВ матываваны рознымі значэннямі ўтваральных слоў або нятоеснымі, але семантычна і структурна блізкімі лексемамі.

Умоўныя абазначэнні

БДС – Шаталава Л. Ф. Беларускае дыялектнае слова. Мн.,1975; Бяльк. – Бялькевіч І. К. Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны. Мн., 1970;ДС – Юрчанка Г. Ф. Дыялектны слоўнік (З гаворак Мсціслаўшчыны). Мн.,1966; ЖНС – Жывое народнае слова. Мн., 1992; Касп. – Каспяровіч М. І. Віцебскі краёвы слоўнік. Віцебск,1927; МДСГ – Матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны // Беларуская мова. Мн., 1977, вып. 5; МММГ-70, МММГ-74 – Матэрыялы для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак. Мн., 1970,1974; Нас. – Насовіч І. І. Слоўнік беларускай мовы. Мн., 1983; НВС – Юрчанка Г. Ф. Народнае вытворнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны. Мн., 1981-1985, т. 1-3; НЛ – Народная лексіка. Мн., 1977;

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

НЛГ – Народная лексіка Гомельшчыны ў фальклоры і мастацкай літаратуры. Мн., 1983; НС – Народнае слова. Мн., 1976;СГЦР – Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі. Мн., 1990; СНС – Юрчанка Г. Ф. Сучаснае народнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны. Мн., 1988; СПЗБ – Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча. Мн., 1979-1986, т. 1-5;СРЛГ – Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны. Гродна,1999; Сцяшк. – Сцяшковіч Т.Ф. Матэрыялы для слоўніка Гродзенскай вобласці. Мн., 1972; Сцяшк., Сл. – Сцяшковіч Т. Ф. Слоўнік Гродзенскай вобласці. Мн., 1983; 'тс' – 'тое самае'; ТС – Тураўскі слоўнік. Мн., 1982-1987, т. 1-5; ТСБМ – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Мн., 1977 – 1984, т. 1-5; Цых. – Цыхун А. П. Скарбы народнай мовы. Гродна, 1993; Янк.I,III – Янкоўскі Ф. М. Дыялектны слоўнік. Мн., 1959, вып. 1; 1970, вып. 3; Яўс. – Яўсееў Р. М. Маці казала так... Мн., 1978.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Тихонов А. Н.*** Словообразовательные омонимы в русском языке // Русский язык в школе. – 1971. – №1. – С. 90-91.
2. ***Яцкевич Л. Г.*** О разграничении лексической и словообразовательной многозначности слова // Веснік БДУ. – Серыя IV. – 1983. – № 1. – С. 39-40.
3. ***Виноградов В. В.*** Проблемы морфематической структуры слова и явления омонимии в славянских языках // Славянское языкознание. VI международный съезд славистов. – М., 1968.
4. ***Соболева П. А.*** Словообразовательная полисемия и омонимия. – М., 1980. – С. 86-87.
5. ***Старычонак В. Дз.*** Полісемія ў беларускай мове (на матэрыяле субстантываў): Дыс. ... д-ра філал. навук. – Мн., 1997.
6. Гл.: ***Никитевич В. М.*** Основы номинативной деривации. – Мн., 1985; ***Кубрякова Е. С.*** Типы языковых значений. Семантика производного слова. – М., 1981; ***Архипов И. К.*** Семантика производного слова английского языка. – М., 1984.
7. ***Морозова Т. С.*** О фразеологичности семантики производных слов (на материале отглагольных существительных) // Русский язык в национальной школе. – 1983. – №3. – С. 17.

SUMMARY

Objective regularities of irrespective word-formation from the same root and according to one derivative model in dialects and in literary language have been revealed in the article. Types of correlation between derivative and formative lexemes have been distinguished here. Special attention was paid to the connection between derivative processes and semantic characteristics of formative units.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова